УДК 378.14:811.161.3

**ВАСЮКОВІЧ ЛЮДМІЛА СЯРГЕЕЎНА,**

**доктар педагагічных навук, прафесар**

УА «Віцебскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава»,
г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь

# МЕТАДЫЧНАЯ КАМПЕТЭНТНАСЦЬ БУДУЧЫХ НАСТАЎНІКАЎ У КАНТЭКСЦЕ ФАРМІРАВАННЯ ФУНКЦЫЯНАЛЬНАЙ ПІСЬМЕННАСЦІ НАВУЧЭНЦАЎ

Метадычная кампетэнтнасць як інтэграваная характарыстыка будучага настаўніка прадвызначае гатоўнасць і здольнасць эфектыўна вырашаць прафесійныя задачы. У кампетэнтнасным фармаце функцыянальная пісьменнасць трактуецца як інструмент паспяховай сацыялізацыі асобы, як шматслойнае паняцце, што вызначаецца структураванасцю кампанентаў: кагнітыўнага, матывацыйнага, дзейнаснага, рэфлексійна-каштоўнаснага.

*Ключавыя словы:* метадычная кампетэнтнасць; функцыянальная пісьменнасць; кампаненты; функцыянальна значымыя аспекты функцыянальнай пісьменнасці.

Сённяшнія трансфармацыі ў грамадстве – дынамічнае развіццё лічбава-камунікатыўных тэхналогій, інтэлектуалізацыя працоўных працэсаў, інфарматызацыя – патрабуюць пераасэнсавання стратэгій навучання. У кантэксце дыдактычных навацый праблема кампетэнтнасці, канкурэнтаздольнасці педагогаў набывае асаблівую актуальнасць. Як вядома, нельга рэфармаваць школу без змен у сістэме падрыхтоўкі педагагічных кадраў. Пры падрыхтоўцы спецыялістаў новай генерацыі за пункт адліку прымаецца якасць як прыярытэтная катэгорыя педагогікі XXI стагоддзя. Якасць выяўляе ступень адпаведнасці адукацыйных вынікаў дзейным стандартам і вучэбным праграмам, а таксама запатрабаванням соцыуму. Ацэначныя працэдуры маюць за мэту «атрымаць інфармацыю для ацэнкі дасягненняў вучняў як спосабу іх рэйтынгавання і функцыянавання сістэмы ў цэлым» [6, с. 5].

Стратэгічнай задачай сучаснай сістэмы адукацыі з’яўляецца дасягненне новых адукацыйных вынікаў, якія ўключаюць фарміраванне функцыянальнай пісьменнасці. Згодна з «Адукацыйнымі стандартамі агульнай сярэдняй адукацыі» адной з вядучых мэт

навучання выступае «дасягненне выпускнікамі *ўзроўню функцыянальнай пісьменнасці*, валоданне агульнымі ўменнямі, навыкамі, спосабамі дзейнасці, кампетэнцыямі, неабходнымі для сацыялізацыі, свядомага і адказнага выбару жыццёвага і прафесійнага шляху» [5]. У каардынатах фарміравання функцыянальнай пісьменнасці найперш неабходна весці размову пра гатоўнасць і здольнасць будучых настаўнікаў да падобнай працы. Сучасны педагог павінен быць функцыянальна пісьменнай асобай, дэманстраваць здольнасць да самаразвіцця, самарэфлексіі, забяспечваць фарміраванне ўніверсальных кампетэнцый навучэнцаў.

Вядучым паняццем у педагагічнай сферы з'яўляецца метадычная кампетэнтнасць настаўніка як атрыбут яго прафесійнай падрыхтоўкі. *Метадычная кампетэнтнасць* вызначаецца намі як інтэграваная характарыстыка асобасных і дзелавых якасцей педагога, якая сістэмна рэпрэзентуе веды, уменні, вопыт, гатоўнасць і здольнасць асобы да творчай самарэалізацыі ў прафесіі. У структурных адносінах метадычная кампетэнтнасць складаецца з наступных кампанентаў: кагнітыўнага, матывацыйнага, дзейнаснага і рэфлексійна-каштоўнаснага.

*Кагнітыўны кампанент* вылучаецца намі на аснове прынцыпу прыярытэтнай ролі ведаў у навучанні (працы Г.С. Касцюка, Л.У. Занкова, Д.Б. Эльконіна і інш.), якія выступаюць базісам для выпрацоўкі ўменняў функцыянальнай пісьменнасці. Зазначым, што ні адзін з апанентаў ведавай парадыгмы не адмаўляе ролі ведаў пры навучанні. Іншая справа, што сёння пытанне фармулюецца наступным чынам: ведавая састаўляючая з'яўляецца прыярытэтнай або выступае сродкам (не мэтай) пазнавальнай дзейнасці навучэнцаў? Зразумела, што веды, інфармацыя без уменняў аналізаваць, разважаць, мысліць творча, крытычна не гарантуюць адоранасці асобы. У сённяшніх умовах роля кагнітыўнага складніка павышаецца, паколькі сфарміраванасць ведавай асновы сведчыць пра пэўны ўзровень інтэлектуальна-маўленчага развіцця, пра здольнасць да крытычнага ўспрымання інфармацыі, фармулявання высноў і ўласнай пазіцыі. Гэтая састаўляючая прадугледжвае фарміраванне комплексу метадычных ведаў будучага настаўніка:

- засваенне нарматыўна-прававой базы вышэйшай і агульнай сярэдняй адукацыі;
- асэнсаванне заканамернасцей, прынцыпаў, метадаў, прыёмаў, форм арганізацыі адукацыйнага працэсу;
- веданне актуальных праблем у кантэксце спецыяльнасці;
- валоданне асноватворнымі паняццямі курса методыкі выкладання прадмета;
- дасведчанасць у галіне адукацыйных тэхналогій;
- спазнанне гісторыі развіцця методыкі вучэбнай дысцыпліны. Як вядома, будучыня вырастае з мінулага, традыцый, рэфлексіі вопыту, назапашанага папярэднімі пакаленнямі.

*Матывацыйная састаўляючая* метадычнай кампетэнтнасці выступае сістэмаўтваральным фактарам. Эфектыўнасць і выніковасць пазнання залежныя ад прафесійнага інтарэсу да педагагічнай дзейнасці, абранай спецыяльнасці, навукова-метадычных здабыткаў, зместу вучэбных дысцыплін, што чытаюцца ў кантэксце ўніверсітэцкай адукацыі. Устойлівымі паказчыкамі паспяховасці асобы служаць дамінаваная патрэбнасць ва ўдасканаленні педагагічнага майстэрства, адносіны да прафесіі як да ўласнай, грамадскай і дзяржаўнай каштоўнасці, аб’ектыўнасць аналізу асабістых дасягненняў і прычын няўдач, прагназаванне перспектыў свайго інтэлектуальнага развіцця.

У рэчышчы фарміравання матывацыйнага кампанента трэба прызнаць: квінтэсэнцыяй працы выкладчыка ўніверсітэта з’яўляецца навучанне студэнтаў у рэжыме самаадукацыі, прафесійнага станаўлення, мэтанакіраванага жадання набыць якасную падрыхтоўку, адаптаванасці ў настаўніцкім калектыве.

Роля *дзейнаснага кампанента* агульнапрызнаная, у класічнай трактоўцы «працэс навучання ёсць працэс дзейнасці» (А.А. Лявонцьеў). Недастаткова засвоіць веды, іх трэба «прымусіць працаваць», уключаць ва ўласную дзейнасць. У рэчышчы дзейнаснай тэорыі ў пазнавальным працэсе забяспечваецца перанос акцэнтаў з «таго, што ты ведаеш», на тое, «якія веды ты ўмееш прымяняць у розных сітуацыях» [3, с. 5]. У логіцы кампетэнтнасных вымярэнняў значнасць мае не столькі аб’ём ведаў, колькі «прысваенне» навучэнцамі разумовых і практычных спосабаў дзейнасці. Дзей-

насны падыход, распрацаваны ў даследаваннях Л.С. Выгоцкага, В.В. Давыдава, П.Я. Гальперына, А.М. Лявонцьева, Д.Б. Эльконіна, прызнае, што развіццё асобы забяспечваецца праз фарміраванне ўніверсальных вучэбных дзеянняў: *навыкаў асэнсаванага чытання, прымянення лагічных аперацый (аналіз, сінтэз, параўнанне, класіфікацыя), знакава-сімвалічных сродкаў, актыўнага валодання сучаснымі тэхналогіямі, рознымі спосабамі працы з вербальнай і невербальнай інфармацыяй, уменняў планаваць, кантраляваць і ацэньваць уласныя дасягненні* і інш. Дзейнасны фармат заняткаў – конкурсы, форумы, круглыя сталы, дэбаты, дыялогавыя пляцоўкі, канферэнцыі – актуалізуе ўменні разважаць, параўноўваць, аргументаваць, палемізаваць. У рамках названага кампанента важна прасачыць, якім чынам прадметныя дзеянні перарастаюць у метапрадметныя, становяцца ўніверсальнымі.

*Рэфлексійна-каштоўнасны кампанент*, скіраваны на самавызначэнне асобы, выяўляе метадычнае мысленне, метадычную культуру будучага настаўніка, здольнасць развіваць інавацыйныя ідэі. Кампанент падразумявае фарміраванне адэкватных ацэначных адносін да ўласнай дзейнасці, спрыяе засваенню культурнага кода сваёй краіны, сацыяльных норм, «адказвае» за развіццё станоўчых адносін да прафесіі, да працэсу пазнання.

Названыя кампаненты метадычнай кампетэнтнасці знаходзяцца ў дыялектычнай узаемасувязі, таму змест паняцця не можа быць раскрыты аднааспектна. Метадычная кампетэнтнасць выступае інтэграванай характарыстыкай асобы настаўніка, якая ўключае, апроч кагнітыўнага, матывацыйнага, дзейнаснага, рэфлексійна-каштоўнаснага кампанентаў, *функцыянальна значымыя аспекты*:

• *сацыяльны.* У межах функцыянальнай пісьменнасці ключавымі становяцца сацыяльна-асобасныя кампетэнцыі будучых настаўнікаў. Гэта актуалізуе «сацыякультурную місію адукацыі як сістэмы па ўзнаўленні назапашанага сацыяльнага вопыту ў кантэксце ўзмацнення ролі чалавека ў грамадскім развіцці» [2, с. 6]. Вышэйшая адукацыя нясе адказнасць за сацыялізацыю асобы, за яе гатоўнасць да патрыятычнага выхавання маленькіх грамадзян вялікай краіны, да раўнапраўнага партнёрства ва ўмовах устойлівага развіцця грамадства, да якаснага выканання розных сацыяльных

роляў – члена сям'і, соцыуму, выбаршчыка, пакупніка, кліента, гледача, слухача і інш.;

• *аксіялагічны аспект.* Актуалізуецца падрыхтоўка асобы, якая валодае сістэмай этнакультурных і агульначалавечых каштоўнасцей. Паказчыкамі выступаюць засваенне каштоўнаснай карціны свету, фарміраванне педагога, падрыхтаванага да талерантнага супрацоўніцтва з усімі суб'ектамі адукацыйна-выхаваўчага працэсу. Метадычная кампетэнтнасць падразумявае наяўнасць прафесійных каштоўнасцей, адносіны да сваёй прафесіі як каштоўнасці;

• *інтэграваны аспект.* Метадычная кампетэнтнасць як сукупны вынік адукацыі развіваецца на аснове аўдыторнай, самастойнай, навукова-даследчай дзейнасці, засваення аперацый кантролю, ацэнкі і рэфлексіі вынікаў навучання. Метадычная кампетэнтнасць мае сістэмна-дзейнасны характар, падразумявае адзінства каштоўнасных, этычных, навуковых, псіхолага-педагагічных і ўласна метадычных ведаў, уменняў і асобаснага вопыту прафесійнай дзейнасці;

• *інфармацыйна-камунікатыўны аспект.* Станаўленне прафесіянала адбываецца ва ўмовах сучасных тэхналогій. Калі падчас падрыхтоўкі будучы настаўнік не набывае лічбавых кампетэнцый, бессэнсоўна чакаць ад маладога спецыяліста інтэрактыўных інавацыйных рашэнняў. Фарміраванне функцыянальна кампетэнтнага педагога магчыма пры ўмове праектавання адукацыйнага працэсу, інтэграванага ў сучасныя мадэлі тэхнічна аснашчаных школьных класаў і кабінетаў. Падкрэслім: мы бачым у інфарматызацыі адукацыйнага працэсу не толькі тэхналагічную састаўляючую, але і гарманічнае адзінства з працэсам гуманізацыі;

• *мультымедыйны аспект.* Будучыя педагогі забяспечваюцца адукацыйнымі рэсурсамі featured рознага фармату: друкаванымі кнігамі, аўдыя- і відэазапісамі, інтэрнэт-матэрыяламі, мультымедыйнымі лекцыямі ў сціслым, схематызаваным выглядзе (табліцы, калажы, малюнкі, дыяграмы), даведачнымі выданнямі, слоўнікамі метадычных тэрмінаў, біяграфічнымі даведнікамі (звесткі пра знакамітых вучоных, іх асноўныя працы ў галіне дыдактыкі), рабочымі сшыткамі, трэніровачнымі/кантрольнымі тэстамі, дапаможнікамі для самастойнай працы, рэкамендацыямі для педагагічнай практыкі, партфоліа дасягненняў і інш.

Удзельная вага метадычнай кампетэнтнасці ўзрастае на сённяшнім рынку працы, на які выходзіць пакаленне Z. Гэта абавязвае адпавядаць запытам інфармацыйнага грамадства, належнаму ўзроўню гатоўнасці прымяняць сучасныя методыкі і тэхналогіі для забеспячэння якасці вучэбна-выхаваўчага працэсу, арганізацыі навучання ў дыялогавым і праектным фармаце. Метадычная кампетэнтнасць забяспечвае пераход ад фрагментарнай да цэласнай педагагічнай карціны свету ў шырокім культурным кантэксце. Адказнасць перад навучэнцамі, перад сабой, грамадствам – гэта якасць характарызуе сучаснага выпускніка з развітай метадычнай кампетэнтнасцю.

У сённяшніх каардынатах метадычная кампетэнтнасць дэманструе *гатоўнасць да фарміравання функцыянальнай пісьменнасці.* З кампетэнтнасна-арыентаваных пазіцый функцыянальная пісьменнасць будучых педагогаў бачыцца ключавым паняццем, якое:

• аб’ядноўвае разумовую і на́выкавую састаўныя;

• характарызуецца зместам, заснаваным на адукацыйных выніках: асабовых, метапрадметных, прадметных;

• вызначаецца структураванасцю кампанентаў: кагнітыўнага, матывацыйнага, дзейнаснага, рэфлексійна-каштоўнаснага;

• з’яўляецца інструментам сацыялізацыі;

• валодае інтэграванай прыродай функцыянальна значымых аспектаў: сацыяльнага, аксіялагічнага, інфармацыйна-камунікатыўнага, мультымедыйнага.

З мэтай актуалізацыі ідэй функцыянальнай пісьменнасці ў практыцы школ і вышэйшых навучальных устаноў варта:

• з улікам таго, што «навуковае супольніцтва мае сур’ёзныя напрацоўкі ў кантэксце сутнасці і структуры паняцця» [7, с. 6], уніфікаваць тэрміналогію праблемнага поля функцыянальнай пісьменнасці;

• ад канцэптуальна-тэарэтычнага асэнсавання праблемы трэба зрабіць рашучы крок да распрацоўкі эфектыўнага практычнага інструментарыю фарміравання функцыянальнай пісьменнасці. Узорам у гэтым плане можна лічыць метадычныя рэкамендацыі супрацоўнікаў Акадэміі адукацыі [4];

• правесці выразную дэмаркацыйную лінію паміж статусам функцыянальнай пісьменнасці і ўніверсальных кампетэнцый навучэнцаў. У адваротным выпадку шматварыянтнасць аўтарскіх трактовак прыводзіць да неакрэсленасці метадычнай «рэпутацыі» паняццяў.

Сумесныя напрацоўкі навукоўцаў, метадыстаў, настаўнікаў-практыкаў у кантэксце фарміравання функцыянальнай пісьменнасці забяспечаць жыццяздольнасць ідэі і паслужаць асновай для «перспектыўных педагагічных інвестыцый у будучае маладога пакалення і грамадства ў цэлым» [1, с. 45].

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ

1. Зеленко, О. В. Искусство жить: раскрываем секреты функциональной грамотности в школе / О. В. Зеленко // Адукацыя і выхаванне. – 2024. – № 6. – С. 45–48.

2. Жук, А. И. Социокультурная миссия педагогического образования в условиях парадигмальных перемен: сущность, функции, механизмы реализации / А. И. Жук, А. В. Позняк // Педагогика. – 2022. – № 4. – С. 5–12.

3. Леонтьев, А. А. Что такое деятельностный подход в образовании / А. А. Леонтьев // Начальная школа: плюс – минус. – 2001. – № 1. – С. 3–6.

4. Мох, Е. Н. Методические рекомендации по разработке учебных пособий, ориентированных на формирование функциональной грамотности обучающихся при изучении учебных предметов историко-обществоведческого направления / Е. Н. Мох, Г. Э. Давидовская, Е. Ю. Смирнова // Адукацыя і выхаванне. – 2024. – № 7. – С. 12–23.

5. Образовательные стандарты общего среднего образования [Электронный ресурс]. – Режим доступа : https://adu.by/images/2019/01/obr-standarty-ob-sred-obrazovaniya.pdf. – Дата доступа : 17.05.2025.

6. Развитие системы оценки качества образования в Республике Беларусь. Общее среднее образование / М. Б. Горбунова [и др.] ; под науч. ред. В. Ф. Русецкого. – Минск : Национальный институт образования, 2022. – 390 с.

7. Русецкий, В. Ф. Формирование функциональной грамотности как научная и образовательная проблема / В. Ф. Русецкий, О. В. Зеленко // Веснік адукацыі. – 2020. – № 10. – С. 5–13.

VASYUKOVICH LYUDMILA SERGEEVNA,
Doctor of Pedagogical Sciences, Professor
Vitebsk State University named after P.M. Masherov,
Vitebsk, Republic of Belarus

# METHODOLOGICAL COMPETENCE OF FUTURE TEACHERS IN THE CONTEXT OF THE FORMATION OF FUNCTIONAL LITERACY OF STUDENTS

Methodological competence as an integrated characteristic of a future teacher predetermines the readiness and ability to effectively solve professional problems. In the competency-based format, functional literacy is interpreted as a tool for the successful socialization of an individual, as a multi-layered concept distinguished by the structure of its components – cognitive, motivational, activity-based, and reflexive-value-based.

*Key words:* methodological competence; functional literacy; components; functionally significant aspects of functional literacy.